View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

УДК 821.161.3.09.

# ЛІТАРАТУРА ЯК ІНСТРУМЕНТ ПАЗНАННЯ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ Я.КОЛАСА)

***Святлана Чувак***

*Гродна, Беларусь*

Артыкул прысвечаны асаблівасцям мастацкага (слоўнага) мадэлявання свету і чалавека. На прыкладзе творчасці класіка беларускай літаратуры Я.Коласа аналізуюцца асаблівасці яго творчага метаду і ролі ў развіцці нацыянальнай літаратуры.

ПолесГУ

***Ключевые слова: художественная литература, автор, модель мира, восприятие, Я.Колас***

Нязменная цікавасць філасофскай, культуралагічнай думкі да семіятыных і лінгвістычных праблемаў выклікана разуменнем культуры як мадэлі значэнняў, якія перадаюцца гістарычна, увасоблены ў сімвалы, сістэму спадчынных уяўленняў, выражаных у форме сімвалаў, пры дапамозе якіх людзі маюць стасункі паміж сабою і на аснове якіх фіксуюцца і развіваюцца іх веды пра жыццё і жыццёвыя ўстаноўкі"[2, С.219]. Культуры складаюцца з розных знакавых сістэм розных узроўняў (мова, рэлігія, навука, літаратура і інш.). Кожная з такіх сістэм па-рознаму мадэлюе свет у залежнасці ад сваіх магчымасцяў, іншымі словамі, зыходзячы са свайго інструментарыя, канкрэтных сацыяльных, гістарычных і многіх іншых акалічнасцяў, ствараецца мноства рэалізацый карцінаў свету з канкрэтным сэнсавым напаўненнем, зразумелым найперш тым, хто іх стварае і тым, хто іх спажывае. Так з'яўляюцца разнастайныя мадэлі свету або іх фрагменты. Нятоеснасць, разнароднасць такіх знакавых мадэляў забяспечвае шматграннасць бачання свету, кампенсацыю недахопа інфармацыі у той ці іншай сістэме. У выніку такога шматкодавага мадэлявання рэчасінасці ствараецца агульная мадэль свету культуры.

Эстэтычная дзейнасць, яе спецыфічныя сродкі і формы выражэння, на нашу думку, вельмі прыдатныя для даследвання чалавека, яго месца і ролі ў грамадстве ў канкрэтных прасторава-часавых абставінах, дакладней кажучы, праз мадэль свету, выражаную ў мастацкіх творах можны выйсці на складовыя элементы карціны свету культуры. У чым жа заключаецца прывабнасць мастацтва, у тым ліку і слоўнага, як крыніцы даследвання?

Прыдатнасць мастацкай мадэлі свету вынікае з задачы любой мастацкай дзейнасці - не павялічыць нашыя веды пра аб'ектыўныя асаблівасці свету, не ўключыць нас у свет эмоцый, а адкрыць жыццё, паказаць тое, што ляжыць за значэннем, г.зн. за грамадска-гістарычным вопытам, апрадмечаным у прыладах працы, сацыяльных нормах і каштоўнасцях, пранікнуць за абыякавасць аб'ектыўнасці, практычнай, тэарэтычнай, пазнаваўчай дзейнасцяў. Па гэтай прычыне эстэтычныя адносіны ў пэўным сэнсе універсальныя, бо яны падтрымліваюць універсальную карціну свету, г.зн. культуру.

Такім чынам, мастацтва функцыянуе як творчы адказ на рэчаіснасць, функцыя мастацтва фіксуецца не толькі на ўзроўні ўзаемадзеяння паміж мастацтвам і групай, мастацтвам і субкультурай, і мастацтвам і асобай. Акрамя таго, мастацтва з'яўляецца спосабам інстытуцыялізацыі групавых і субкультурных карцінаў свету. Пры гэтым нельга сцвярджаць, што яно з'яўляецца толькі спосабам інстытуцыялізацыі той карціны свету, якая характэрна для субкультуры мастацкай інтэлігенцыі. Як паказаў К.Манхейм, выключнай функцыяй інтэлігенцыі будзе яе здольнасць у той ці іншай гістарычнай сітуацыі зрабіць выбар, г.зн. ставіць у цэнтр грамадскай увагі каштоўнасныя арыенціры, а значыць, і карціну свету якой-небудзь адной групы [1, С.72]. Напрыклад, у беларускай культуры пачатку XX ст. на першае месца выходзіць сялянская субкультура.

Кожная асоба, аўтар засвойвае штосьці з фонду калектыўных ідэяў, уяўленняў, стэрэатыпаў, актыўна адбірае, пераўтварае, па-свойму факусуе чужое, выбудоўвае свой уласны ўнутраны свет, гэта значыць прапануе спажыўцу сваіх твораў сваю мадэль свету. Якуб Колас так азначаў для сябе сутнасць мастацкай, літаратурнай творчасці: "Навука адмаўляцца ад першапачатковай праўды – таго, што было ў сапраўднасці, і выклікаць на свет новую праўду – тое, што ўбачыў мастак. І каб усе ўспрымалі створаную ім праўду, нібыта ніколі не існавала той першай, праўды рэчаіснасці" [9, С.114].

Узнікае пытанне: наколькі мадэль свету, прапанаваная мастаком, аўтарам адпавядае мадэлям, якія пануюць у свеце яго сацыяльнай супольнасці. Калі кожны чалавек унікальны, то унікальным і з'яўляецца яго погляд на жыццё, г.зн. яго карціна свету. Цэлым шэрагам псіхолагаў было даказана, што існуе паняцце тыпу асобы. У



Полесгу

псіхалогіі такіх спробаў класіфікацыі існуе некалькі. Гэтым займаліся такія аўтарытэтныя навукоўцы як Э.Крэчмер, К.Юнг, Э.Фром і інш. У дадзеным выпадку мастацтва выступае спосабам актуалізацыі карціны свету мастака як індывідуальнай карціны свету. Справа яшчэ і ў тым, што калі з дапамогай свайго твора мастак прыцягвае чытачоў таго ж псіхалагічнага тыпу, то размова ідзе не толькі пра актуалізацыю індывідуальнай карціны свету. У такой сітуацыі пры кантакце з аудыторыяй размова ідзе пра пра сацыялізацыю і інстытуцыялізацыю індывідуальнай карціны свету ў мастацкіх формах. Выключнасць мастацтва заключаецца ў тым, што толькі часам мастацтва выступае спосабам аб’яднання індывідаў, якія належаць да аднаго пісхалагічнага тыпу. У гэтым сэнсе яно выступае не проста транслятарам індывідуальнай карціны свету, а спосабам, які правакуе усведамленне існавання ў грамадстве ўтварэння, якое можна назваць сацыяльнай групай ці субкультурай. Формы тэкстаў самі канструююць “сацыяльныя пляцоўкі ўспрымання“, і новыя формы рэцэпцыі твораў ствараюць новыя аудыторыі. Па гэтай прычыне культурныя дыферэнцыяцыі трэба разглядаць непасрэдна ў працэсе іх стварэння – у канкрэтных формах: тэкстаў і ў канкрэтных культурных практыках, бо толькі ў іх яны і існуюць.

Мастацкая літаратура з'яўляецца спецыфічным відам мастацкай дзейнасці, яе асаблівасць заключаецца ў тым, што літаратура мае справа са словам, мовай, якая выступае як унікальны знакавы комплекс культуры, што робіць яе галоўным інтэгратарам мадэлі свету культуры. Мастак з дапамогай слова апрацоўвае свет, для чаго слова павінна іманентна пераадольвацца як слова, стаць выразнікам свету іншых і выразнікам адносінаў аўтара да гэтага свету [10, С.16]. Мову апрацоўвае мастак, але не як мову; як мову ён яе пераадольвае, бо яна не павінна ўспрымацца як мова ў яе лінгвістычнай акрэсленасці (марфалагічнай, сінтаксічнай, лексічнай і інш.), а пакольку яна становіцца сродкам мастацкага выражэння. Слова павінна перастаць адчувацца як слова. Мастак стварае не ў міры мовы, мовай ён толькі карыстаецца [8, С.76].

Менавіта мастацтва дазваляе праігрываць апераджальныя варыянты таго, што А.Маслоу называе самаактуалізацыяй асобы, г.зн. сацыалізацыяй немагчымага для рэалізацыі у жыцці у эстэтычных формах. Гэта акалічнасць робіць мастацтва прыцягальным, бо яно аказваецца адзіным сродкам інстытуцыаналізацыі асабістага зместу, развіццё якога грамадскае жыццё або не дапускае або стрымлівае. Па гэтай прычыне В.Тэрнэр піша, што мастак рэалізуе невыкарыстаны эвалюцыйны патэнцыял чалавецтва, які яшчэ не ўвасобіўся ў канкрэтную форму і не зафіксаваны структурай [2, С.137].

Канец ХІХ-пач.ХХ ст. - пачатак эпохі нацыянальнага Адраджэння, асаблівасць гэтай пары ў гісторыі культуры ў тым, што нацыянальнае Адраджэнне павінна было ісці поруч з асветніцтвам, прыйшоў час сцвярджаць карэнныя ідэі і прынцыпы нацыянальнай самасвядомасці. Спецыфіка развіцця беларусазнаўства ў той час заключалася ў тым, што багаты матэрыял аб этнічных асаблівасцях давала не толькі ў фальклырыстыка, этнаграфія, гісторыя, але і мастацкая літаратура. Гэта можна патлумачыць асаблівасцямі фармавання і развіцця новай беларускай літаратуры. Нават у 1905–1917 гадах, дасягнуўшы значных мастацкіх вышыняў, яна не была “чыстым“ мастацтвам. Наадварот яна была перш за ўсё сродкам нацыянальнага адраджэння беларускага народу, мастацкая творчасць адначасова была палітычнай, грамадскай, навуковай, асветніцкай дзейнасцю [9, С. 27–28]. Менавіта ў такі складаны і цікавы час і вельмі выразна стаў гучаць мастацкі талент Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча – Якуба Коласа. Як творчая асоба Колас – з’ява унікальная. Маштаб яго непаўторнага, самабытнага таленту здзіўляе шматграннасцю праяўлення творчых здольнасцей: паэт, празаік, драматург, публіцыст і перакладчык, вучоны і арганізатар айчыннай навукі, лексікограф, літаратурны крытык, педагог і метадыст. І ў кожнай галіне народны пясняр пакінуў глыбокі, яскравы след [10, С. 9].

ПолесГУ

Па паходжанні селянін, Якуб Колас прайшоў складаны шлях станаўлення свайго мастацкага светапогляду. Безумоўна, паходжанне, сям'я аказала значны ўплыў на фармаванне светапогляду мастака ў рэчышчы традыцыйнай сялянскай культуры. Духоўныя патрэбы мастака супалі з галоўнымі тэндэнцыямі літаратурнага працэсу свайго часу, яго творчасць стала адказам, рашэннем задачаў, якія паўсталі перад нацыянальна свядомай часткай грамадства. Філасофія асуджанасці саступіла месца аптымістычнай філасофіі адраджэння, упэўненасці, што беларуская культура, абапіраючыся на багатыя традыцыі мінулага, здолее пераадолець сваё часовае адставанне [2, С. 30]. Неабходна было выпрацаваць новы погляд на галоўнага героя – селяніна і ўвасобіць гэты погляд ў канкрэтных вобразах, гэта значыць паказаць хлебароба не толькі як ахвяру несправядлівага сацыяльнага ладу, але і як унутрана багатую асобу, здольную сваімі сіламі дабіцца лепшага жыцця [2, С. 10]. Найперш самому селяніну трэба было данесці яго маральную вартасць і каштоўнасць яго як асобы.

Менавіта Колас уздымае вобраз беларускага селяніна на незвычайную па сваёй мастацкай вартасці вышыню. І робіць ён гэта ва ўласцівай толькі яму манеры. Пераважная большасць даследчыкаў творчасці Я.Коласа прыходзяць да высновы, што мастак – найперш вельмі "зямны"(азначэнне І.Навуменкі) паэт эпічнага дараванне [2, С. 45]. У сваіх творах пісьменнік не шукае яркае, выключнае. Тое, што знаходзіцца вакол чалавека вёскі, праявы штодзённасці, побыт і з'яўляюцца прадметам адлюстравання ў творах класіка. Як зазначае У.Гніламёдаў "свет бачыцца паэту ў яго дыферэнцыраванай матэрыяльна-рэчыўнай прадметнасці, багацці і плоцевасці фарбаў" [2, С. 47]. Творчая спадчына Коласа заснаваная на трывалым грунце рэчаіснасці, прасякнута імкненнем цэласна, шматмерна, універсальна ахапіць жыццё і спазнаць яго карэнныя сэнсавыя і прычынныя высновы [10, С. 9] Вось як сам Колас фармуляваў сваё мастацкае крэда, цытуючы словы А.Чэхава: "Чем предмет обыкновеннее, тем выше нужно быть поэту, чтобы извлечь из него необыкновенное и чтобы это необыкновенное было, между прочим, совершенная истина" [9, С. 113–114]. Менавіта ў паўсядзённасці шукае Колас праявы высокага, прыгожага, быццёвага, таго, што выяўляе сутнасць характару, прычыны, механізмы, матывы ўчынкаў і паводзінаў. Побыт у яго творах наогул можна лічыць адным з важнейшых стылёва-жанравых, сацыяльна-псіхалагічных кампанентаў. У коласаўскім разуменні побытавая рэальнасць дае пісьменніку вельмі шырокія магчымасці для раскрыцця і самавыяўлення чалавека. Пра гэта ён гаварыў у шэрагу сваіх літаратурна-публіцыстычных артыкулаў, а галоўным чынам – падмацоўваў сваю думку мастацкім словам, звычайна аддаючы перавагу бытавому эпізоду, дзе пабуджае чалавека раскрыцца выключна важнай і ў многіх выпадках сутнаснай рысай сваёй індывідуальнасці. «Чалавек, - як адзначае Ю.С.Пшыркоў, - цікавіць пісьменніка сваёй веліччу, бязмежнасцю праяўлення свайго светлага розуму, імкненнем рассунуць свае далягляды, каб пазнаць непазнанае, раскрыць тайну невядомага, настойлівымі імкненнямі заваяваць перамогу над магутнымі сіламі прыроды» [8, С. 84].

Самыя разнастайныя, часам супярэчлівыя, праявы сялянскай культуры выяўляюцца ва ўсёй творчасці Коласа: у ранніх іранічных апавяданнях-замалёўках вясковага жыцця ("Чорт", "Дзяліцьба" і інш.), у алегарычным цыкле апавяданняў "Казкі жыцця", у трылогіі "На ростанях", у паэтычных шэдэўрах мастака – паэмах "Новая зямля" і "Сымон-музыка". Ды і вобраз селяніна прайшоў сур'ёзную эвалюцыю. У ранніх апавяданнях, лірыцы лірычны герой – пераважна збіральны вобраз або адзін з грамады (вершы "Рольнік", "Мужычае жыццё", апавяданні "Выбар старшыні", "Калодка пчол" і інш.). Паступова Колас праз больш шырокі паказ духоўнага свету сваіх персанажаў ад "мы" пераходзіць да "я", да выражэння "самасці" (тэрмін В.Жураўлёва), індывідуальнасці, выходзіць на стварэнне манументальнай, шырокай па часава-прастораваму ахопу мадэлі быцця беларуса ў свеце – вобраз Міхала ў паэме "Новая зямля".

Коласу было важна не толькі паказаць селяніна, намаляваць яго вобраз, а знайсці водгук на сваю творчасць, бо найперш сялянству яна была скіраваная. І ён выдатна



Полесгу

рэалізаваў гэту высакародную асветніцкую задачу. Мадэль сялянскага свету, прапанаваная Коласам на старонках яго твораў, ва многім супала са светаадчуваннем і светаразуменнем яго чытачоў. Аўтар не глядзіць на вёску збоку, холадна і разважліва. Яго аповяд – гэта расказ кагосьці з грамады, вясковага чалавека, які нічым не вылучаецца са свету, пра які расказвае і таму можа прадставіць яго беспамылкова.

Творчасць Якуба Коласа была шырока запатрабавана не толькі яго сучаснікамі, але і наступнымі пакаленнямі. Ідэі, вобразы, малюнкі твораў мастака былі блізкімі і зразумелымі не толькі простым беларускім сялянам, але і ўсім тым, хто дбаў аб будучыні беларусаў, аб развіцці беларускай культуры. Эстэтыка твораў Якуба Коласа, іх глыбокі маральна-філасофскі патэнцыял у многім прадвызначылі не толькі развіццё нацыянальнай беларускай літаратуры, але вылучылі асобу самога пісьменніка як ідэолага нацыянальнага Адраджэння. Мастацтва Коласа дапамагала будаваць светапогляд будучага. Творчасць Якуба Коласа стала дыялогам паміж паэтам і нацыяй: ён ставіў пытанне перад нацыяй пра самае важнае ў яе лёсе, а нацыя павінна знайсці такі адказ, які прадчуваў і рыхтаваў паэт, г.зн. Коласавы мастацкія творы знаходзілі водгук у нацыянальнай супольнасці, уздзейнічалі на яе мысленне і тым самым стваралі з сялянскага светаразумення нацыянальны, беларускі светапогляд. Сфармуляваныя Коласам ідэалы і сімвалы, вылучаная ім структура светаразумення сялянства былі актыўна падтрыманы не толькі мастакамі словамі наступных пакаленняў, але і многімі з тых, хто разважаў аб лёсах беларускага этнасу ў пазнейшы час.


1. Жураўлёў, В.П. Чалавек на шляху "малой" і вялікай свабоды/ Жураўлёў В.П. // Каласавіны Матэрыялы навуковай канферэнцыі, Мінск, 2–3 лістапада 1997 / Дзярж. літ.-мемар. музей Я.Коласа; рэд.І.А.Зайцава. – Мінск,1998. – С. 71–75.
2. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію / Гніламёдаў У. – Мінск : Маст.літ., 2001. – 246с.
3. Колас, Я. Аўтабіяграфія / Якуб Колас // З жыццяпісу Якуба Коласа: дакументы і матэрыялы/ АН БССР, Ін-т літ-ры імя Я.Купалы; уклад. Г.В.Кісялёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – С. 251–253.
4. Колас, Я. Аўтабіяграфія 1913 года / Якуб Колас // З жыццяпісу Якуба Коласа: дакументы і матэрыялы / АН БССР, Ін-т літ-ры імя Я.Купалы; уклад. Г.В.Кісялёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – С. 285–287.
5. Колас, Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах./ Я.Колас. – Мн. : Маст. літаратура,1972. – Т. 1. Вершы 1898–1917гг. – 243с.
6. Колас, Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах / Я. Колас. – Мн. : Маст. літаратура,1972. – Т. 4. Апавяданні 1908–1917г. – 189 с.
7. Колас, Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах / Я. Колас. – Мн. : Маст. літаратура, 1972. – Т. 6. “Новая зямля”, “Сымон-музыка”. – 345с.
8. Максімовіч, В. Я. Колас і мадэрнізм / Максімовіч В. // Каласавіны Матэрыялы навуковай канферэнцыі, Мінск, 2–3 лістапада 1997 / Дзярж. літ.-мемар. музей Я.Коласа; рэд. І.А. Зайцава. – Мінск, 1998. – С. 76–77.
9. Міцкевіч, Даніла Слова пра бацьку // Успаміны пра Я.Коласа / Склад. І.С. Курбека. – Мн. : Маст. літ., 1982. – 182–183 с.
10. Мушынскі, М. Свайму часу і вечнасці / М.Мушынскі // Колас Я. Збор твораў у 20 т. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – Т.1. Вершы (1898–1910). – 2007. – С.8–145


Полесгу